ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 32 (865) ● ЧАЦВЕР, 16 лістапада 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXVI

## СПЫНІЦЬ КРЫВАВУЮ РУКУ АГРЭСАРАЎ!

**Перапоўнен болем, гневам і горыччу Зварот міністра асветы ДРВ, міністра вышэйшай і сярэдняй прафесіянальнай адукацыі і прафсаюза выкладчыкаў Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам да міністраў асветы, міністраў вышэйшай адукацыі, арганізацый і прафсаюзаў работнікаў асветы, пісьменнікаў, дзеячоў мастацтва і грамадскіх дзеячоў, да школьных і студэнцкіх арганізацый, да народаў усяго свету.**

**У Звароце гаворыцца, што амерыканскія імперыялісты пры дапамозе розных самалётаў і розных відаў сучаснай зброі робяць стаўку цяпер на знішчэнне густанаселеных раёнаў ДРВ, дзе знаходзіцца вялікая колькасць школ. Разбурана больш 200 вучэбных установ, забіты сотні настаўнікаў і вучняў. Інтэнсіўнасць паветраных налётаў усё ўзмацняецца. Толькі ў верасні і пачатку кастрычніка 1972 года больш 150 школ паслужылі мішэнямі для амерыканскіх самалётаў.**

**Знішчаюцца здабыткі гераічных намаганняў народа, які ў барацьбе з многімі цяжкасцямі здолеў пабудаваць шматлікія школы ў краіне, дзе раней 90 працэнтаў насельніцтва было непісьменным, стварыў дасканалую сістэму адукацыі, пры якой цяпер на кожныя тры жыхары прыходзіцца адзін навучэнец.**

**Наўмысныя нападзенні на школы з прымяненнем такой жорсткай зброі, як фугасныя, шарыкавыя, асколачныя бомбы, масіраваныя налёты знішчальнага характару сведчаць аб злачынных планах амерыканскіх імперыялістаў, якія імкнуцца загубіць будучае народа.**

**Ад імя 200.000 прафесараў, выкладчыкаў і членаў прафсаюза работнікаў асветы, ад імя 7 мільёнаў вучняў і студэнтаў, ад імя бацькоў вучняў Міністэрства асветы, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй прафесіянальнай адукацыі і прафсаюза работнікаў асветы ДРВ з абурэннем асуджаюць перад сусветнай грамадскасцю жорсткія злачынствы амерыканскіх імперыялістаў.**

**Заключныя словы Звароту заклікаюць грамадскасць усіх краін спыніць злачынствы амерыканскага імперыялізму.**

**«Спыніце крывавую руку амерыканскіх імперыялістаў, забойцаў настаўнікаў і вучняў, разбуральнікаў школ у ДРВ!»**



*Пераможцы Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ — студэнты гістарычнага факультэта І. ШЫРШОЎ, Г. ІЛЬЯШЧУК, В. ГАРГОЦ.*

Фота *Д. Чаховіча.*

## КЛОПАТ АБ НАШЫМ ДОМЕ

**Адбыўся пленум прафкома універсітэта, на якім разгледжан стан культурна-масавай і палітыка-выхаваўчай работы ў інтэрнатах. З дакладам выступіў старшыня прафкома М. Дрозд. Ён адзначыў, што ў многіх інтэрнатах усё яшчэ не наведзен парадак. Так, у інтэрнаце № 6 у чытальных залах, у ленінскім пакоі паламаная мэбля. Дрэнна аформлен інтэрнат № 7. Тут не працуе тэлевізар. Старшыня студсавета гэтага інтэрната апраўдваў сваю бяздзейнасць перанаселенасцю інтэрната. Але ў інтэрнатах № 1 і № 4 жыве столькі ж студэнтаў, і тым не менш гэтыя інтэрнаты зачялі I і II месцы ў аглядзе.**

**У інтэрнаце № 1 студэнты самі афармілі ленінскі пакой, падрыхтавалі новыя стэнды, выпускаюць сатырычную газету. У гэтым месяцы быў праведзен вечар сустрэчы з артыстам Лакштанавым, а зусім нядаўна прыязджалі госці — студэнты з Ленінграда.**

**Інтэрнат № 4 мае цудоўна аформлены ленінскі пакой. Але, як высветлілася з выступленняў, камендант інтэрната У. І. Сцяпанаў адкрывае пакой толькі для камісій. А можна ж назначыць дзяжурных, як гэта робіцца ў інтэрнаце № 1, якія б сачылі за парадкам. А так, можа здарыцца, пражыве чалавек пяць гадоў у інтэрнаце і не пасядзіць у ленінскім пакоі, не паглядзіць тэлевізар, не пачытае газет, падшыўкі якіх, дарэчы, у гэтым інтэрнаце не вядуцца.**

**А вось насценныя газеты выходзяць добрыя. Цяпер рэдакцыя на чале са студэнтам А. Міхальчанкам рыхтуе штомесячныя радыёперадачы.**

**Шмат добрага, дзелавога можна дабіцца пры агульных намаганнях студэнцкіх саветаў, каменданта і камітэта камсамола. Яскравым прыкладам такога ўзгодненага дзеяння з'яўляецца інтэрнат № 1.**

**Н. ПЯТРУША.**
**(Карпункт прафкома).**

## У ПАРТКОМЕ

На ЧАРГОВЫМ пасяджэнні партыйнага камітэта разгледжана пытанне аб стане палітыка-выхаваўчай работы са студэнтамі на юрыдычным факультэце. Як адзначылі члены камісіі, якія праводзілі праверку, палітыка-выхаваўчая работа на юрфаку праводзіцца ў адпаведнасці з планам, складзеным на семестр. У плане знайшлі адлюстраванне пытанні палітычнага, працоўнага, фізічнага і эстэтычнага выхавання. Ход выканання запланаваных мерапрыемстваў кантралюецца партыйным бюро, саветам факультэта, кафедрамі, грамадскімі арганізацыямі.

У ідэйна-палітычным выхаванні студэнтаў выкарыстоўваюцца разнастайныя формы: лекцыі, даклады, гутаркі, сустрэчы з практычнымі работнікамі органаў юстыцыі, дыспуты, канферэнцыі чытачоў, палітінфармацыі. У іх правядзенні ўдзельнічаюць куратары, сярод якіх чатыры прафесары, 12 дацэнтаў, 13 старшых выкладчыкаў. Вялікую выхаваўчую работу вядуць куратары В. В. Сарокіна, М. А. Гарбар, М. Н. Прыходзька і некаторыя іншыя.

Значная ўвага ўдзяляецца на факультэце прыцягненню студэнтаў да навукова-даследчай работы. Так, на студэнцкай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю ўтварэння СССР, выступіла 47 чалавек. У мінулым годзе на рэспубліканскі конкурс было прадстаўлена 15 студэнцкіх работ, а сёлета—34.

Пэўную работу праводзяць партбюро і дэканат у студэнцкім інтэрнаце.

Разам з тым камісія адзначыла сур'ёзныя недахопы ў арганізацыі палітыка-выхаваўчай работы на факультэце. Так, пры падрыхтоўцы да працоўнага семестра была дапушчана памылка ў падборы кіраўнікоў будаўнічых атрадаў. Выявіліся недахопы і пры падвядзенні вынікаў выканання сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 50-годдзя СССР. У грамадскай рабоце са студэнтамі прымае ўдзел вузкае кола выкладчыкаў. Многія выкладчыкі не бываюць у інтэрнатах, не ўдзельнічаюць у факультэцкіх мерапрыемствах, а гэта, вядома, адмоўна ўплывае на грамадскую актыўнасць студэнтаў. Многія з іх, у тым ліку і камуністы, не маюць даручэнняў, некаторыя з іх парушаюць дысцыпліну, прапускаюць заняткі, робяць амаральныя ўчынкі.

Партбюро, выкладчыкі факультэта, куратары слаба вывучаюць і накіроўваюць духоўныя запатрабаванні студэнтаў, не цікавяцца, якую мастацкую літаратуру яны чытаюць.

Сур'ёзныя пралікі дапускае партбюро ў арганізацыі палітінфармацый, правядзенне якіх перадаверана куратарам і, пасутнасці, застаецца бескантрольным.

Недастаткова выкарыстоўваецца ў выхаваўчых мэтах насценны друк.

У прынятай пастанове партыйны камітэт абавязаў партбюро на працягу лістапада распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы, каб ліквідаваць недахопы ў палітыка-выхаваўчай рабоце са студэнтамі.

Партбюро, дэканату прапанавана скласці графік палітінфармацый і строга кантраляваць яго выкананне. Рэкамендавана партбюро і кафедрам распрацаваць меры па арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў на прадпрыемствах, будоўлях, у навучальных установах.

На працягу лістапада партбюро, дэканату трэба размеркаваць паміж кафедрамі тэрміны правядзення гутарак, лекцый у студэнцкіх інтэрнатах. Кантроль за работай ускладаецца на загадчыкаў кафедр.

Камітэту камсамола і прафбюро прапанавана прыцягнуць усіх студэнтаў да актыўнай грамадскай работы, дабіцца, каб кожны меў канкрэтнае даручэнне.

## СЕМІНАР ФІЗІКАЎ

З 15 лістапада ва універсітэце праходзіць IV занальны семінар-нарада па методыцы выкладання фізікі ў вну БССР, Латвійскай ССР, Літоўскай ССР і Калінінградскай вобласці РСФСР. У семінары прымаюць удзел вучоныя Калінінградскага, Латвійскага, Тартускага і Вільнюскага універсітэтаў, а таксама вну Беларусі.

Культурная праграма для гасцей прадугледжвае экскурсіі па Мінску, у Хатынь, на Курган Славы, у музеі, тэатры горада, а таксама наведанне вну сталіцы.

**На здымках:** лекцыю па курсу «Метэаралогія і кліматалогія» студэнтам II курса геафака чытае прафесар **А. Я. Шкляр.**







Камсамольскае жыццё

# ВУЧЫЦЦА КАМСАМОЛЬСКІ АКТЫЎ

Вядома, што поспехі камсамольскай арганізацыі ў многім залежаць ад ступені падрыхтоўкі яе кіруючага звяна. Будзе сам актывіст эрудзіраваным, добрым арганізатарам — яго пачын заўсёды знойдзе водгук у калектыве. І таму невыпадкова на вучобу ў школе камсамольскага актыву мы звяртаем асаблівую ўвагу. На філфаку такая школа дзейнічае другі год, яна ахоплівае вялікае кола навучэнцаў: ад членаў групавога бюро да членаў камітэта камсамола факультэта.

Нядаўна на пленарным пасяджэнні перад слухачамі школы выступілі інструктар сектара палітмасавай работы ЦК ЛКСМБ Т. Паўлава і загадчык аддзела абароннамасавай і спартыўнай работы ЦК ЛКСМБ В. Філіповіч. Яны расказалі аб формах масавай прапаганды сярод моладзі і яе героіка-патрыятычным выхаванні. З дакладам аб задачах камсамольскіх арганізацый вну па выкананню пастановы ЦК КПСС аб вышэйшай школе выступіла сакратар Мінскага АК ЛКСМБ С. Сіманькова. Павышэнню ролі камсамольскіх арганізацый у вучэбнай і палітмасавай рабоце студэнтаў прысвяціў сваё выступленне намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта У. Сілін.

Далейшая вучоба камсамольскага актыву будзе праходзіць па секцыях. Яна спланавана такім чынам, каб увесь выбарны актыў набыў навыкі камсамольскай работы па ўсіх напрамках. Для правядзення практычных заняткаў прыцягнуты адказныя камсамольскія работнікі, члены партыйнага бюро і камітэта камсамола факультэта і універсітэта. Вопытам камсамольскай работы падзеляцца М. М. Піпчанка, У. А. Навумовіч, І. Рабчынская, І. Ключановіч.

Як паказвае практыка, правядзенне такіх семінараў камсамольскага актыву дае станоўчыя вынікі. Актывісты шырэй уяўляюць сабе аб'ём камсамольскай работы, задачы пярвічнай арганізацыі, сваё месца і ролю ў камуністычным выхаванні моладзі. Умела спалучаючы паўсядзённую практычную работу з тэарэтычнай падрыхтоўкай, камсамольскі актыў набывае якасці арганізатараў моладзі.

**А. НАДОЛЬСКАЯ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола філфака па арганізацыйнай рабоце.**

# ПАВІННА ХВАЛЯВАЦЬ УСІХ

Паспяховасць студэнта. Напэўна, няма больш хвалюючага пытання.

...Я размаўляю з сакратаром камітэта камсамола біяфака В. Нясюк: «Паспяховасць... На жаль, пахваліцца няма чым. Паказчыкі вучобы біёлагаў ва універсітэце амаль самыя нізкія. Чым гэта растлумачыць? Напэўна, недастатковай работай камітэта камсамола, тым, што акадэмічны сектар амаль на працягу года не звяртаў увагі на дысцыпліну студэнтаў, наведванне імі лекцый, не трымаў моцнай сувязі з камсамольскімі групамі. Наогул, я лічу, што больш дзейсным быў бы сістэматычны кантроль за паспяховасцю студэнтаў з боку таварышаў, іменна таго калектыву, дзе вучыцца камсамолец. Менавіта тады на групавых і курсавых камсамольскіх сходах па-сапраўднаму узнімаліся б пытанні вучобы, студэнты адчувалі б, наколькі адказная іх праца, і ведалі б, што ні адзіны пропуск лекцый не застанецца без увагі і за нядобрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў прыйдзецца трымаць адказ перад таварышамі, строгімі і прынцыповымі».

...У мяне ў руках даволі доўгі «чорны» спіс. Вальшчук В., Хваянок Г., Мізрахі Л., Арцішэўская І... Усяго трынаццаць прозвішчаў, трынаццаць камсамольцаў. Ужо некалькі разоў «здаюць» яны біяхімію, і столькі ж разоў праяўляецца іх незвычайная, проста выключная «эрудыцыя» ў гэтым пытанні. Дык дазвольце запытаць: «Ці месца ім ва універсітэце, ці маюць яны права ў будучым насіць ганаровае званне настаўніка?!

Вядома, каб ліквідаваць гэтыя прабелы, сур'ёзныя недахопы, неабходна ў корані перабудаваць работу акадэмічнага сектара.

Я прысутнічала на пасяджэнні камітэта камсамола, калі абмяркоўвалі і зацвярджалі планы работы сектараў. Адказны акадэмсектара Бяляўскі, улічыўшы ўсе памылкі мінулага года, прапанаваў па-сапраўднаму баявы, канкрэтны план работы, дзе асабліва многа ўвагі звернута на работу з першакурснікамі. І гэта зразумела. Трэба ўжо з першых дзён строга і патрабавальна кантраляваць вучобу камсамольцаў з тым, каб пазбегнуць зробленых раней памылак.

Заслугоўвае ўвагі прапанова, унесеная камсамольцамі: стварыць сумесна з хімікамі кансультацыйныя пункты па дапамозе першакурснікам у рашэнні задач, асабліва па неарганічнай хіміі.

Адказны за работу з першакурснікамі В. Касцюк паведаміў, што іх ужо пазнаёмілі з факультэтам і універсітэтам, а таксама з бібліятэкамі Мінска.

І можна спадзявацца, што работа наладзіцца, калі з агеньчыкам, сур'ёзна і падзелавому возьмуцца за справу савет выдатнікаў, які ўзначальвае В. Еўтушэнкаў, акадэмічны сектар камітэта камсамола, калі пытанні вучобы будуць хваляваць не толькі дэканат і камітэт камсамола, але і кожнага камсамольца, усю арганізацыю ў цэлым!

**Т. СКІБІЦКАЯ.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ СТУДЭНТАЎ

Заўтра прагрэсіўнае чалавецтва свету адзначае Міжнародны дзень студэнтаў.

У радах мужных барацьбітоў за мір, дэмакратыю і сацыялізм цвёрдым крокам ідуць замежныя студэнты, якія вучацца ў Савецкім Саюзе і, у прыватнасці, у нашым універсітэце. Яны ўпэўнена трымаюць сцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму. Вельмі радасна адзначыць тое, што ў шматнацыянальную студэнцкую сям'ю з кожным годам уліваюцца новыя магутныя сілы.

Замежныя студэнты, убачыўшы нашу краіну наяву, глыбей зразумелі сілу пралетарскага інтэрнацыяналізму. Толькі ў адзінай дружнай сям'і народы Савецкага Саюза—непераможныя.

У мінулым годзе студэнты маладой рэспублікі С'ера-Леоне паспяхова закончылі падрыхтоўчы факультэт нашага універсітэта. Сёлета мы рады вітаць пасланцоў з рэспублікі Бангладэш.

**В. КАЛАДЗІНСКІ.**

*НАСУСТРАЧ 50-ГОДДЗЮ СССР*

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ВУЧОНЫХ

Вядома, што амаль палова тэрыторыі Беларускай ССР адносіцца да басейна Балтыйскага мора. Праблемы фарміравання чыстай вады пад уплывам геафізічных і біялагічных працэсаў, аховы вод ад забруджвання, праблемы выкарыстання біялагічных рэсурсаў, рацыяналізацыі і інтэнсіфікацыі рыбнай гаспадаркі на ўнутраных вадаёмах — гэта ўзаемазвязаныя праблемы, агульныя для ўсіх унутраных вадаёмаў басейна Балтыйскага мора. Гэта даўно ўсвядомілі гідрабіёлагі, іхтыёлагі і рыбаводы Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Карэліі, а таксама абласцей Расійскай Федэрацыі, якія знаходзяцца ў Балтыйскім басейне. На працягу многіх год цесна супрацоўнічаюць вучоныя гідрабіёлагі і іхтыёлагі Прыбалтыкі. Канкрэтным праяўленнем гэтага супрацоўніцтва служаць штогадовыя навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя даследаванню ўнутраных вадаёмаў Савецкай Прыбалтыкі.

Пачынаючы з 1953 года навуковыя канферэнцыі праводзяцца пачаргова ў Рызе, Вільнюсе, Мінску, Таліне і Петразаводску. У Мінску, у сценах нашага універсітэта, праходзілі V (1957 г.), X (1963 г.) і XV (1970 г.) прыбалтыйскія канферэнцыі.

Характэрная рыса канферэнцый — масавы актыўны ўдзел у іх рабоце навуковай моладзі Прыбалтыйскіх рэспублік. Запрашэнне атрымліваюць таксама вучоныя Масквы, Кіева, Новасібірска і іншых навуковых цэнтраў Савецкага Саюза, спецыялісты з Польскай Народнай Рэспублікі.

Пастаянныя сустрэчы даследчыкаў, абмеркаванне поспехаў і недахопаў у рабоце садзейнічаюць развіццю гідрабіялогіі і іхтыялогіі, павышэнню дзелавой кваліфікацыі кадраў. Тут калектыўна выпрацоўваюцца ўзгодненыя рашэнні, вызначаюцца напрамкі далейшага развіцця даследаванняў, шляхі і спосабы ўкаранення рэкамендацый навукі ў народную гаспадарку.

Я пастаянна ўдзельнічаю ў рабоце навуковых канферэнцый па вывучэнню ўнутраных вадаёмаў Прыбалтыкі пачынаючы з 1957 г. і назіраў імклівы рост навукова-даследчай актыўнасці ў галіне гідрабіялогіі і іхтыялогіі ў Літоўскай, Эстонскай і Латвійскай Савецкіх рэспубліках. Вялікае развіццё атрымалі гэтыя галіны і ў нас у Беларусі. А якія цудоўныя кадры даследчыкаў выраслі за гэты час!

Паездкі на канферэнцыі ў брацкія рэспублікі даюць шырокія магчымасці лепш пазнаёміцца з жыццём народа, асаблівасцямі яго нацыянальнай культуры, мастацтва, дасягненнямі ў гаспадарчай дзейнасці.

Вузы братэрскага супрацоўніцтва вучоных Беларусі і Прыбалтыйскіх рэспублік яшчэ больш узмацніліся дзякуючы цеснай каардынацыі даследчых работ па Міжнароднай біялагічнай праграме на тыповых вадаёмах Эстоніі, Літвы і Беларусі.

Чарговая, XVII навуковая канферэнцыя па вывучэнню ўнутраных вадаёмаў Прыбалтыкі скліканецца ў эстонскім горадзе Тарту. Яна будзе прысвечана пяцідзесяцігадоваму юбілею СССР.

**В. ЛЯХНОВІЧ.**



**Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за вялікія поспехі ў развіцці навукі і вышэйшай адукацыі, у падрыхтоўцы і камуністычным выхаванні высокакваліфікаваных спецыялістаў прафесару Ільі Рыгоравічу НЕКРАШЭВІЧУ прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі БССР.**

*Гэтае паведамленне было ўспрынята з вялікай радасцю ўсімі супрацоўнікамі і студэнтамі фізічнага факультэта.*

*Ілья Рыгоравіч—адзін са старэйшых работнікаў БДУ. Пачатак яго навуковай і педагагічнай дзейнасці супадае з перыядам станаўлення і развіцця фізічных даследаванняў у нашым універсітэце. У гады вайны ён — актыўны ўдзельнік партызанскага руху. У цяжкі пасляваенны час І. Р. Некрашэвіч адным з першых прыступае да аднаўлення лабараторый, да наладжвання педагагічнай і навуковай работы на факультэце. У 1961 годзе за плённую навуковую і педагагічную работу ён узнагароджваецца ордэнам Леніна. Цяпер Ілья Рыгоравіч Некрашэвіч — загадчык кафедры радыётэхнікі і фізічнай электронікі.*

**Рэдкалегія насценнай газеты фізфака «ЗА НАВУКУ» папрасіла Ілью Рыгоравіча адказаць на некалькі пытанняў:**

# КРЫНІЦА ВЯЛІКАЙ РАДАСЦІ

**— Што з'яўляецца характэрным для фізічнага факультэта ў цяперашні час і якім Вы ўяўляеце яго ў будучым?**

— Бадай, найбольш характэрным для нашага факультэта з'яўляецца яго хуткі колькасны і якасны рост. Сапраўды, за апошнія 15 год колькасць студэнтаў, аспірантаў, супрацоўнікаў кафедр на ім амаль патроілася, якасць выпускаемых спецыялістаў па ўзроўню іх агульнай тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі рэзка ўзрасла. Хутка расце і колькасць супрацоўнікаў, абараняючых дысертацыі. Фізфак больш цесна, чым другія факультэты універсітэта, звязан з перадавымі прадпрыемствамі навейшых галін прамысловасці. Крывая росту колькасці навуковых работ, выкананых на кафедрах факультэта, мае від экспаненты. Усё гэта сведчыць аб тым, што наш фізфак сапраўды знаходзіцца ў радах «галоўнай калоны» сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. А гэтыя абставіны з'яўляюцца гарантыяй таго, што фізфак і ў будучым замацуе і трывала будзе ўтрымліваць сваё месца ў радзе найбольш перадавых фізічных факультэтаў універсітэтаў Савецкага Саюза.

**— Якім чынам Вам удаецца сумяшчаць такую вялікую педагагічную і навуковую работу? Ад Вас гэта, відавочна, патрабуе вялікага самакантролю, дысцыпліны на працягу ўсяго жыцця?**

— Яшчэ ў студэнцкія гады, якія праходзілі ў цяжкі перыяд станаўлення Савецкай улады, у мяне, як і ў большасці маіх аднагодкаў, выпрацавалася прывычка шмат і ўпарта працаваць, нягледзячы на любыя цяжкасці. Беднасць абсталявання лабараторый прымушала знаходзіць спосабы не толькі больш эфектыўнага выкарыстання нешматлікіх дакладных прыбораў, але і знаходзіць новыя метады саміх вымярэнняў. Недахоп падручнікаў папаўняўся упартай працай над літаратурай і канспектамі лекцый. Недахоп лабаранцкага саставу прывучыў да неабходнасці дасканала ведаць не толькі тэорыю і практыку работы з фізічнымі прыборамі, але і ўмець самастойна рамантаваць іх незалежна ад таго, хто ты ёсць: асістэнт, дацэнт або прафесар.

Вось гэтая прывычка заўсёды шмат працаваць у любімай галіне навукі ў спалучэнні з прывычкай рэгулярна займацца фізкультурай з гадамі замацавалася і стала чымсьці само сабой зразумелым, не выклікаючым якіх-небудзь цяжкасцей фізічнага або «псіхічнага» характару. А паход у тэатр або на прагляд добрага кінафільма заўсёды дае поўны адпачынак тым мазгавым клеткам, якія найбольш перагружаны.

**— Але ўсё-такі чалавек стамляецца. Ці заўжды Вы задаволены выбарам прафесіі? Ці часам хочацца заняцца чым-небудзь іншым?**

— На гэта пытанне хочацца адказаць так: фізіка і ўсё, што з ёю звязана, стала аб'ектам маіх пастаянных інтарэсаў яшчэ з тых пор, калі я ўпершыню сам разлічыў і зрабіў індукцыйную катушку і іскравы радыёперадатчык з трафейных нямецкіх дэталей часоў першай сусветнай вайны. Гэтая зацікаўленасць да фізічных навук застаецца галоўным інтарэсам у маім жыцці. І я заўсёды аднолькава радаваўся, калі ў мяне атрымліваліся прыгожыя вынікі ў эксперыменце, і калі я, чытаючы папулярную лекцыю па навейшых праблемах фізікі ў рабочай або калгаснай аўдыторыі, бачыў, як спыняецца шум і ўсталёўваецца поўная цішыня, якая сведчыць аб тым, што слухачы захоплены выкладаемым матэрыялам.

Але фізіка — надзвычай шырокая галіна ведаў. І, займаючыся глыбокім вывучэннем толькі «сваёй» вузкай галіны, добра адпачываеш, заглядваючы час ад часу ў суседнія галіны, што прымыкаюць да тваёй «запаветнай».

**— Што Вы можаце параіць студэнцкай моладзі, якая стаіць на парозе навуковай працы?**

— Вялікае шчасце для чалавека, які імкнецца ў навуку, — быць творцам, а не рамеснікам у ёй. Гэтага можна дасягнуць толькі ў тым выпадку, калі ўсе твае думкі і імкненні будуць накіраваны на рашэнне пастаўленай задачы. І павінна гэта адбывацца не насільна, а само па сабе. А атрымаецца гэта «само па сабе» тады, калі, вывучыўшы аб даным прадмеце ўсё да гэтай пары вядомае і аднačасова пазнаўшы, што ёсць яшчэ і нязведанае, у цябе з'явіцца гарачае жаданне пазнаць гэтае нязведанае. Калі такое жаданне падмацоўваецца разлікам, пастаноўкай эксперыменту, калі пры гэтым паяўляецца спакой і ўпартасць пры ўзнікшых няўдачах або цяжкасцях і яны пачынаюць перааадольвацца, — узнікаюць першыя радасці дасягнутых — няхай пакуль малых — перамог. З гэтага і пачынаецца сапраўдная навуковая творчасць. Яна падтрымліваецца дакладнай, паслядоўнай пастаноўкай асобных задач у межах адной, агульнай. Ствараецца ўстойлівая «дамінанта» ў мазгавым апараце, і гэта прыводзіць да новых дасягненняў. А яны — крыніца вялікай чалавечай радасці, не меншай, чым тая, якая дасягаецца мастацтвам, дружбай, любоўю, добрымі адносінамі ў калектыве, сям'і.

Поспех у навуцы дасягаецца тады, калі ўсё жыццё чалавека падпарадкавана навуцы. Але гэта зусім не азначае, што чалавек навукі адхіляецца ад усяго, наадварот, ён уключаецца ва ўсе галіны нармальнага асабістага і грамадскага жыцця, размяркоўваючы іх, аднак, такім чынам, каб яны садзейнічалі яго асноўнай дзейнасці — навуковай творчасці. А вось як гэта зрабіць — ужо залежыць ад асабістых якасцей і валявых магчымасцей чалавека, якія можна выхаваць у сабе найбольш паспяхова якраз у студэнцкія гады.

**Інтэрв'ю правёў М. БОРТНІК.**
*Фота Г. МАРОЗАВА.*

# У ІМЯ АЙЧЫНЫ

**Ад гэтых стэндаў на біяфаку, бадай, ніхто не адыходзіць раўнадушным. «Аб тых, хто выстаяў», «Заўсёды з намі» — гераічныя старонкі біяграфій супрацоўнікаў біяфака, тых, хто выстаяў у цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны і сёння працягвае працаваць, выхоўваючы маладое пакаленне, і тых, чыё жыццё абарвалася ў фашысцкіх засценках.**

**Фатаграфіі і матэрыялы стэнда «Аб тых, хто выстаяў» вяртаюць нас да суровых ваенных гадоў.**

**Вось юны мсцівец А. У. Царук (цяпер выкладчык гісторыі КПСС). У 1941 годзе ён толькі закончыў сем класаў, а калі пачалася вайна, разам з ўсёй сям'ёй ідзе ў лес да партызан. Тут Аляксандр Уладзіміравіч атрымаў баявую загартоўку. Ён удзельнічае ў разгроме нямецкіх і паліцэйскіх гарнізонаў, разбурэнні чыгуначных дарог і іншых аперацыях партызанскага атрада.**

**Наступныя старонкі — «Дарогамі вайны», «Незабыўнае», «Партызан і салдат», «У тыле ворага», «Першыя выстралы», «У баях за Беларусь», «Доўгачаканы дзень», «Юнацтва ў агні» — насычаны яркімі фактамі, жывымі ўспамінамі. Гэта хвалюючы расказ аб людзях, самааддана выканаўшых свой воінскі доўг, аб узнагародах, якімі Радзіма адзначыла іх подзвігі.**

**Беражліва захоўваюць на факультэце памяць аб загінуўшых у час вайны супрацоўніках біяфака.**

**Члены партыйнага бюро зрабілі вялікую справу: звязаліся з роднымі загінуўшых, запісалі ўспаміны, адшукалі фатаграфіі, сабралі публікацыі аб гэтых людзях у газетах і часопісах, архіўныя матэрыялы. Так з'явіўся стэнд «Заўсёды з намі». Ён расказвае аб мужных падпольшчыках дацэнце Яўгену Міхайлавічу Зубковічу, аспірантцы Зінаідзе Іванаўне Завістовіч, выкладчыку Анастасе Васільевічу Вязовічу, якога вайна застала з групай студэнтаў на вучэбнай практыцы ў Белавежскай пушчы.**

**Гэтыя людзі загінулі, але памяць аб іх жыве ў калектыве біяфака, а подзвіг іх выхоўвае моладзь у духу беззапаветнай адданасці Айчыне.**

**А. АЛЕНІЧ.**



*Нядаўна ў адрас рэктара, сакратара парткома, сакратара камітэта камсамола нашага універсітэта прыйшло наступнае пісьмо:*

Камандаванне часці, партыйны камітэт, камітэт ВЛКСМ выказваюць Вам і ў Вашай асобе ўсяму калектыву універсітэта глыбокую падзяку за добрае выхаванне былога студэнта, выпускніка геаграфічнага факультэта Сцяпуры Івана Іосіфавіча, які цяпер праходзіць службу ў нашай часці.

Тав. Сцяпура з першых дзён службы праявіў сябе дысцыплінаваным, працавітым і старанным воінам. Свае службовыя абавязкі выконвае дбайна і ініцыятыўна, прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці падраздзяленняў.

Сваімі руплівымі адносінамі да службовых абавязкаў ён заваяваў усеагульную павагу таварышаў.

Нядаўна І. І. Сцяпура вызначыўся сапраўды гераічным учынкам. Здарылася бяда. Маларлетняе дзіця, пераваліўшыся цераз загарадзь, упала ў глыбокі вадаём і стала тануць. Убачыўшы гэта, І. І. Сцяпура кінуўся ў ваду і выратаваў малое.

Бацькі, камандаванне часці, увесь асабовы састаў горача дзякавалі воіну.

У праяўленні высакародных рыс і ў поспехах па службе Івана Іосіфавіча мы бачым перш за ўсё вынікі Вашага мэтанакіраванага выхавання. Мы ўпэўнены, што тав. Сцяпура і ў далейшым будзе высока несці званне савецкага грамадзяніна, абаронцы нашай Радзімы— Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Жадаем Вам і ўсяму Вашаму калектыву новых творчых поспехаў у выкананні гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС па навучанню і выхаванню моладзі.

**Камандзір часці ПАТРЫКЕЕЎ.**
**Намеснік камандзіра часці КРЫСІН.**
**Сакратар парткома РОДЗІН.**
**Сакратар камітэта ВЛКСМ СУШКОЎ.**

## *На подзвіг і працу кліча Радзіма*

# ПРАЙШЛА МАЛАДОСЦЬ РАННЯЯ...

Я прыехаў на сустрэчу са сваім юнацтвам. І хоць горад сустрэў мяне няветліва: насустрач дзьмуў калючы вецер, вострыя сняжынкі ўпіваліся ў твар, але гэта не магло змяніць майго прыўзнятага настрою. Я хваляваўся, быццам спяшаючыся на першае спатканне. І сапраўды ж на спатканне... са сваім армейскім жыццём, якое стала ўжо мінулым.

Знаёмыя вароты. Яны ўпусцілі мяне ў першы раз юнаком, які марыў аб небе. З іх я выйшаў мужчынам, перакананым у сваіх сілах, пазнаўшым «смелае падзенне».

Дэсантнікі... Гэтае слова заўсёды было сімвалам смеласці, мужнасці, творчасці, адвагі. Гэта яны фарсіравалі Днепр у 1943 годзе, запускаліся ў тыл ворага, выконвалі адказныя, рызыкоўныя аперацыі. Салдаты-дэсантнікі і сёння прадаўжаюць баявыя традыцыі сваіх бацькоў. Усебаковая фізічная падрыхтоўка, глыбокае палітычнае выхаванне, выкананне прыжкоў — усё гэта садзейнічае фарміраванню якасцей, неабходных сучаснаму воіну. Нездарма лётчык-касманаўт Г. С. Цітоў пісаў, што па ўзроўню падрыхтоўкі найбольш блізкія да касманаўтаў — дэсантнікі.

Дэсантнікі... Яны такія ж салдаты, як і ўсе. Можа, крыху вышэй ростам, крыху шырэй у плячах, больш пранізлівы позірк у іх. Напэўна, асаблівы гонар за сваё войска. Напэўна, таму так часта гучыць песня:

«Лучше нету войск
на свете,
Чем десантные
войска...»

Як нахохленыя птушкі, стаяць самалёты. Да іх пацягнуліся ланцужкі салдат. Крыху няспрытна рухаючыся, нясуць яны на сваіх плячах парашуты, як альпіністы, узыходзячыя на вяршыню. Цішыню разбудзіў рокат самалётаў. Яшчэ хвіліна, і яны ўзняліся ўверх.

Прыжок для дэсантніка — галоўная праверка яго сіл, волі і мужнасці. Папераджальная каманда вяртае салдат да самакантролю.

Вось яны, самыя трывожныя хвіліны, калі чакаеш каманды: «Пайшоў!», калі сэрца гулка адбівае ўдары, як быццам гатова вырвацца з грудзей, калі па цябе глядзяць вочы сяброў. І не знойдзецца такога, хто спалохаўся б, зрабіў крок назад. З глухім стукам раскрываюцца створкі люка. Свежы вецер урываецца, ахаладжвае гарачыя шчокі. Каманда! Ахоплены парывам, імкнешся ўперад, яшчэ імгненне —і ты пакідаеш паветраны карабель. Першародная цішыня ахоплівае цябе. Здаецца, няма нічога цудоўней, калі плывеш у вялізным нябесным акіяне. Але нядоўга прадаўжаецца блажэнства. Ногі адчулі дотык зямлі. Парашут скінут, трэба выконваць пастаўленую задачу...

Калі вам хто-небудзь скажа, што не баяўся скакаць з парашутам, не хваляваўся, не верце яму. Хваляванне адчувае кожны, гэта ўласціва прыродзе чалавека. Але, разумеючы неабходнасць і важнасць выпрабавання, кожны воін пераступае хваляванне. І нягледзячы на тое, што скачкам папярэднічаюць і за імі ідуць шматкіламетровыя маршы, дэсантнікі любяць гэтыя самыя хвалюючыя, рамантычныя, поўныя сапраўднага шчасця моманты сваёй службы.

...Цьмянае сіняе святло лямпы. Стаіць днявальны, задумліва гледзячы перад сабой. Мерна і санліва дыхае казарма: спяць пасля цяжкага дня дэсантнікі. Я развітваюся з маімі таварышамі і ціха шапчу: «Да сустрэчы, сябры! Чыстага неба і мяккага вам прызямлення!»

А потым крочу па начному гораду. Мокры асфальт адбівае блікі агнёў. Яны пераліваюцца, іскрацца і не перашкаджаюць думаць: на змену салдатам, у якіх заканчваецца тэрмін службы, прыйдуць другія, як мне на змену прыйшлі вось гэтыя. І ў памяці ўсплываюць задушэўныя словы песні:

«Прошла наша
молодость ранняя
В воздушно-десантных
войсках...».

Л. ЛЕВІТ, студэнт.

# ІДУЦЬ ПРАКТЫЧНЫЯ

Да семінарскіх заняткаў студэнты адносяцца па-рознаму. Для каго—«лепш бы іх не было», камусьці яны неаднойчы псавалі настрой, а камусьці прыносяць сапраўднае задавальненне...

У другой групе III курса гісторыкаў ідуць практычныя заняткі па гісторыі СССР. Гэта першыя практычныя пасля святочных выхадных. І ўзнікае думка, што, магчыма, яны пройдуць са скідкай на свята. Але паслухаем...

Першае, што звярнула на сябе ўвагу,—амаль стопрацэнтнае наведванне.

Перад тым, як прадаставіць слова студэнтам, выкладчык Віктар Уладзіміравіч Шаціла папярэджвае: абавязкова спасылацца на дакументы, работы класікаў марксізму-ленінізму.

Тэма заняткаў — «Буржуазныя рэформы 60 — 70 гадоў». Далёкі XIX век, самы бурны яго перыяд, будзяць сённяшнія выступленні. Аб судовай рэформе змястоўна расказвае Валя Ляоненка. Задаволены выкладчык адказам Светы Абрамовіч. Багаты фактамі, цытатамі з ленінскіх работ адказ Наташы Анісімавай аб друку, цэнзуры таго часу. Лёня Гарэлік знаёміць аўдыторыю з ваеннай рэформай.

Па ходу выступленняў Віктар Уладзіміравіч задае пытанні, падкрэслівае важнейшыя факты, зварочвае ўвагу на непрыкметныя дэталі, якія дапамагаюць раскрыць тэму. Цікава, што неаднойчы прагучала пытанне: «А што ў той час у нас, у Мінску?..» Расказваецца аб рэформе асветы — студэнты даведваюцца, між іншым, што на былой Губернатарскай — цяпер вуліцы Леніна—была Марыінская гімназія. Гаворыцца аб забароне нацыянальных моў — а як «Пінская шляхта» была надрукавана?

Крыху здзівіла такая рытмічнасць заняткаў. Не было замінак: пытанне выкладчыка — мінутная цішыня — ўзнятая рука — адказ.

Віктар Уладзіміравіч раскрыў сакрэт. Даючы заданне, ён прапаноўвае кожнае пытанне рыхтаваць 5 чалавекам. Адзін робіць асноўны даклад, найбольш поўны, змястоўны, астатнія—дапаўняючыя.

Увядзенне такой сістэмы правядзення семінарскіх заняткаў апраўдана. Дарэчы, самі студэнты — не сакрэт — часта па сваёй ініцыятыве ўводзяць у групе такое «размеркаванне».

— Законспектаваць такую колькасць работ, якая патрэбна да кожных заняткаў, цяжка. Да таго ж, трэба рыхтавацца да практычных заняткаў па другіх прадметах. Вельмі цяжка рабіць гэта з аднолькавай аддачай, — гаворыць В. У. Шаціла. — Студэнт, які робіць даклад, павінен пазнаёміцца з усімі ўказанымі дакументамі і работамі і пазнаёміць з імі групу. Тыя, хто не паспеў падрыхтаваць канспект, атрымліваюць магчымасць на занятках зрабіць неабходныя для сябе паметкі.

Можна дапусціць, што такая сістэма робіць актыўнай аўдыторыю ў цэлым, але не ахоплівае кожнага індывідуальна. Але калі пакідала аўдыторыю, пачула:

— Першае пытанне ўжо падрыхтавана!

— Я яшчэ ні разу не выступала, дайце мне...

— Я—па другому...

Гэта на будучыя заняткі. Ёсць упэўненасць, што і яны пройдуць гэтак жа добра...

Т. ЗАСІМ.

# У ГАСЦЯХ У «КРЫЖАЧКА»

**Сем гадзін вечара. Закончыліся лекцыі ў студэнтаў другой змены. Адны з іх цяпер спяшаюцца ў бібліятэку, другія ў сталовую (успомнілі, што не абедалі), трэція ў інтэрнат. А вось гэтых юнакоў і дзяўчат, удзельнікаў народнага ансамбля танца «Крыжачок», аб'ядноўвае захапленне майстэрствам танца.**

**Давайце зазірнём на агеньчык да нашых танцораў. Думаю, не пашкадуеце, бо аднойчы мне давялося чуць ад кіраўніка ансамбля М. В. Лапшы:**

**— Пры сустрэчы з «Крыжачком» заўсёды можна ўбачыць штосьці новае, што раней засталося незаўважаным.**

**І вось мы на рэпетыцыі. Параўнаўча невялікая зала юрфака — у распараджэнні аматараў танца. Пад гукі мелодыі «З чаго пачынаецца Радзіма» юнакі і дзяўчаты прыступаюць да практыкаванняў. За іх рухамі ўважліва сочыць Мікалай Вікенцьевіч, прыглядаецца, ці па-мастацку прыгожа і правільна выконваюцца яны.**

**Нарэшце размінка скончылася. Можна пачынаць працаваць з поўнай аддачай сіл, уменнем адкрыць сябе ў танцавальным рытме. Гэтае імкненне адчуваецца асабліва цяпер, калі кожны дзень і кожны час набліжае нас да вялікай падзеі — 50-годдзя ўтварэння СССР. У рэпертуар, прысвечаны залатому юбілею, увахода дзіць звыш дзесяці нумароў. Гэта беларускія народныя танцы «Чобаты» і «Лявонаўская кадрыль», «Крыжачок», украінскі «Гапак», гуцульскі і рускі народны танец «Сустрэча», харэаграфічная кампазіцыя «Камсамольцы дваццатых гадоў», «Малдаўская сюіта» і іншыя.**

**Сёння ў гасцях у «Крыжачка» адзін з удзельнікаў заслужанага калектыву Латвійскай ССР ансамбля народнага танца «Жанцыс» Яніс Почс. Ён прыехаў па запрашэнню беларускіх сяброў паказаць польку «Старога горада». Па словах Галі Цалавальнікавай, аб гэтым танцы калектыў марыў даўно, пасля адной памятнай сустрэчы на фестывалі маладзёжнага мастацтва.**

**Яніс Почс наважан падзяліцца вопытам свайго калектыву, расказаць пра традыцыі, творчыя планы, даведацца аб жыцці і творчых шляхах «Крыжачка».**

**...Госць тлумачыць рух за рухам, імкнецца перадаць нацыянальны характар танца. І хаця пакуль што адзенне звычайнае, аднак аб характары танца выразна гавораць твары танцораў, асабліва Васі Кісяля, Галі Цалавальнікавай, Лены Кузьміной, Ларысы Карпусь.**

**Рэпетыцыя — гэта мазаіка. Асобны каменьчык, блакітны ён ці зялёны, зіхаціць ці свеціцца ледзь прыкметным агеньчыкам, не выклікае моцнага захаплення. А вось калі сабраць іх разам — міжволі залюбуешся прыгажосцю малюнка. Рухі—тыя каменьчыкі, з чаго будуецца танец.**

**Перапынак. Падыходжу да юнакоў і дзяўчат. Стаміліся. Аднак свецяцца радасцю. Дадзім ім слова.**

*Галя ЦАЛАВАЛЬНІКАВА, супрацоўніца БДУ:*

**— Сёлета закончыла хімічны факультэт. З «Крыжачком» не расстаюся, бо колькі цікавага, незабыўнага звязана з ім! Гэта паездкі ў Маскву і Казань, Харкаў і ў іншыя гарады, у Прыбалтыйскія рэспублікі, Малдавію.**

**Пабывалі мы і за мяжой — у ГДР, Балгарыі. Усюды ансамбль меў поспех. На мой погляд, спрыяла яму тое, што ўсе ўдзельнікі «Крыжачка» знайшлі ў харэаграфіі сваё другое прызванне.**

*Аляксандр ЧЫЖЫК, студэнт трэцяга курса хімічнага факультэта:*

**— Танцамі пачаў займацца яшчэ з другога класа, у Доме піянераў. Са школы ведаў і любіў ансамбль універсітэта. Два гады назад мне пашчасціла стаць яго ўдзельнікам.**

**Не сакрэт, што рэпетыцыі, гастрольныя паездкі адымаюць многа часу, але гэта ні ў якім разе не адбіваецца на паспяховасці. Усе мае сябры займаюцца на добра і выдатна, і я амаль усе сесіі здаў выдатна. Акрамя таго, займаюся і грамадскай работай.**

*Таццяна ПТАШНІК, студэнтка III курса геафака:*

**— За творчыя дасягненні ансамблю прысвоена званне народнага. І ў гэтым вялікая заслуга кіраўніка Мікалая Вікенцьевіча Лапшы. Гэта чалавек, моцна ўлюбёны ў мастацтва, выдатны знаўца харэаграфіі, патрабавальны да сябе і да нас. Праца яго не засталася не заўважанай. Мікалай Вікенцьевіч узнагароджан Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, граматамі Міністэрства культуры СССР і БССР.**

*Наташа ДЗЕРНАВАЯ, студэнтка IV курса філфака:*

**— Хутка мы адзначым залаты юбілей краіны. Хочацца як мага больш даведацца пра жыццё і працу, традыцыі свайго народа. Паездкі ў розныя саюзныя рэспублікі дапамаглі нам прыслухацца да пульсу Радзімы. Ёсць у нас сябры і на іншых мерыдыянах. У снежні мінулага года, напрыклад, мы пабывалі ў гасцях у балгарскіх студэнтаў, сустрэліся з дзяржаўным ансамблем танца «Балкан».**

**...Доўгая асенняя ноч даўно ўжо гаспадарыць на зямлі. Разам з Мікалаем Вікенцьевічам, Янісам Почсам, дзяўчатамі мы выходзім на вуліцу. І зноў гутаркі, спрэчкі, довады. Мне неяк міжволі падумалася, што без харэаграфічнага мастацтва свет для іх, аматараў танца, быў бы не такім цікавым і прыгожым.**

**В. СТЭЛЬМАХ, студэнтка.**

# 1972 год аб'яўлен ЮНЕСКА

## Міжнародным годам кнігі

У СССР 300 тысяч бібліятэк, у лік якіх уваходзіць і бібліятэка БДУ — адна з буйнейшых у рэспубліцы. Кніжны фонд нашай бібліятэкі складае 1.117.370 экземпляраў. Кожны год багатым патокам ў яе паступае новая літаратура. Толькі за дзесяць месяцаў 1972 г. бібліятэка папоўнілася 42.785 экземплярамі кніг, не ўлічваючы паступленні ў замежны аддзел і бібліятэку юрыдычнага факультэта.

Акрамя вучэбнай літаратуры, у фондзе нашай бібліятэкі вельмі многа цікавых, каштоўных і рэдкіх выданняў. Напрыклад, кнігі вядомых рускіх падарожнікаў Н. М. Пржэвальскага «3-е падарожжа па Цэнтральнай Азіі» (Спб., 1883), Г. Н. Патаніна «Нарысы Паўночна-Заходняй Манголіі» (СПб., 1881), творы Карамзіна «Гісторыя дзяржавы Расійскай» (выданне Смірдзіна. СПб., 1871), «Старажытнарускія жыція святых як гістарычная крыніца Ключэўскага» (М., 1871) і многа іншых дарэвалюцыйных выданняў. У фондзе ёсць цікавыя пажыццёвыя выданні твораў У. І. Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя» (Пгр., 1918), «Новая эканамічная палітыка». Артыкулы і прамовы (М., 1923), «Тактыка бальшавізму». Выбраныя артыкулы і прамовы 1905—1923 гг. (М., 1923) і іншыя работы.

### СКАРБНІЦА ВЕДАЎ

Каштоўна, што ў аддзеле кнігасховішча пачалі збіраць фонд мініяцюрных фарматаў, дзе ёсць такія выданні, як «Слова аб палку Ігаравым», «Выбранае» Я. Купалы і Я. Коласа, А. Пушкіна, Ш. Руставелі, вершы аб Леніне, бібліятэка рускай савецкай паэзіі ў 50-ці кніжачках і іншыя выданні.

З мэтай паляпшэння інфармацыі і прапаганды літаратуры 3.863 кнігі дэманстраваліся на выстаўках новых паступленняў, 3.070 — на тэматычных выстаўках і выстаўках да знамянальных дат.

Да 50-годдзя ўтварэння СССР была падрыхтавана серыя разгорнутых выставак: «Саюз непарушны рэспублік свабодных», «Дружба скрозь стагоддзі» (дзе былі прадстаўлены кнігі аб савецка-балгарскай дружбе на рускай, беларускай і балгарскай мовах), «Паступіла з вну Польшчы», «ГДР—БДУ» і іншыя.

Аддзел абслугоўвання правёў дыспуты і канферэнцыі, якія прапагандуюць кнігі.

Е. ДУКОР.



## ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

*Працы Карла Маркса і Фрыдрыха Энгельса ў СССР выпушчаны тыражом 96,5 млн. экземпляраў на 81 мове.*

*У СССР цяпер на 100 жыхароў прыходзіцца амаль 570 экземпляраў кніг і 36 газет. У 1913 годзе—па 62 кнігі і 2 газеты.*

*Кожны дзень у нас выпускаецца ў сярэднім 3 млн. кніг, кожную гадзіну—больш 120 тысяч.*

## СВЕТ ЧЫТАЕ ЛЕНІНА

У Савецкім Саюзе і за межамі нашай Радзімы няспынна ўзрастае інтарэс да ідэйнай спадчыны Уладзіміра Ільіча Леніна. Па даных Усесаюзнай кніжнай палаты за гады Савецкай улады працы У. І. Леніна выдаваліся 11.216 разоў тыражом 409,7 млн. экземпляраў на 102 мовах народаў нашай краіны і замежных краін.

Працы Уладзіміра Ільіча былі выпушчаны ў 48 зарубежных краінах 4.079 разоў на 51 мове. Па даных ЮНЕСКА ленінскія творы сярод перакладной літаратуры займаюць першае месца ў свеце.

## ЦІ ВЕДАЕШ ТЫ?

**ПСЕЎДАНІМЫ:**

**А. Ахматава, І. Бунін, А. Безыменскі, Я. Колас, С. Чорны, Е. Пятроў, А. Франс, М. Твен, Дж. Лондан, А. Стэндаль, Ж. Санд, К. Чукоўскі, Д. Бедны, А. Белы, І. Севяранін, А. Грын, Ж. Б. Мальер, Вальтэр, Я. Райніс, В. Верасаеў, Б. Лаўранёў, А. Фет, А. Маруа, К. Чорны, Я. Купала, М. Танк.**

**САПРАЎДНЫЯ ПРОЗВІШЧЫ:**

**А. Глікберг, Франсуа Аруэ, Сяргееў, Э. Герцаг, Н. Раманоўскі, Смідовіч, Пліекшанс, Шэншын, Поклен, Скурко, А. Грынеўскі, Гарэнка, І. Латароў, Бугаеў, Прыдвораў, А. Бейль, Дудэван, Карняйчук, Міцкевіч, Клеменс, Цібо, Луцэвіч, Грыфіт, Гранаткін, Азерскі, Катаеў.**

## СЛОВА АБ КНІГАХ

Лепшыя кнігі чытайце першымі — бо інакш вам, можа быць, не ўдасца прачытаць іх увогуле.

**Генры Давід Тора.**

Кнігі гояць раны, нанесеныя зброяй.

**Хасэ Марці.**

Калі ты не прачытаў ні адной кнігі за тры дні, мова твая губляе яркасць, а твар — прыгажосць.

**Хуан Цінь-Шынь.**

Кніга — гэта каштоўны сасуд, які напаўняе, але сам не становіцца пустым.

**Дэкурсель.**

Кніга — казачная лямпа, якая дорыць чалавеку свет на самых далёкіх і цёмных дарогах жыцця.

**Упіт.**

Усюды... кніга ёсць альфа і амега ўсякіх ведаў, начатак пачатку навукі.

**С. Цвейг.**

# НАВІНКІ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Раман Анатоля ІВАНОВА *«Вечный зов»*. Час дзеяння рамана—1902—1942 гг. Паказваючы сялян і рабочых, падпольшчыкаў і чэкістаў, партыйных работнікаў, байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, пісьменнік малюе шырокую карціну станаўлення і ўзмужнення новага чалавека. У цэнтры рамана — сям'я сібірскіх сялян Савельевых, нялёгкі, поўны драматызму лёс трох братоў — Антона, Фёдара і Івана. За раман «Вечный зов» А. Іванову прысуджана Дзяржаўная прэмія РСФСР імя М. Горкага за 1971 г. і першая прэмія ў конкурсе на лепшы твор мастацкай прозы аб сучасным рабочым класе.

Другой прэміі гэтага ж конкурсу ўдастоены раманы Аляксандра АНДРЭЕВА *«Спокойных не будет»* і Рахмата ФАЙЗІ *«Его величество человек»*.

Першая частка эпапеі Андрэева «Рассудите нас, люди» ўбачыла свет у 1962 г. У другой частцы — «Спокойных не будет» — аўтар працягвае захапляючы лірычны расказ аб маральным узмужненні маладых рабочых, студэнтаў. Кніга незвычайная па форме: у ёй два апавядальнікі, якія вядуць своеасаблівы дыялог. Гэта Алёша Токараў і яго жонка Жэня Каверына. У кожнага з іх сваё кола знаёмых і сяброў, сваё светаўспрыманне, свой погляд на рэчы, з'явы. І гэта дае магчымасць пісьменніку раскрыць шырокую панараму жыцця, цікавы ўнутраны свет сваіх герояў.

Вобраз ташкенцкага кузняца Шахмеда Шахмудава, усынавіўшага і ўдачарыўшага са сваёй жонкай 14 дзяцей розных нацыянальнасцей, паслужыў узбекскаму пісьменніку Файзі прататыпам пры стварэнні галоўнага героя рамана каваля Махкама. Тэма інтэрнацыяналізму, дружбы народаў стала асноўнай у творы Файзі.

Цяжка знайсці чытача, не знаёмага з кнігамі Георгія МАРКАВА *«Строговы», «Соль земли», «Отец и сын»*. Героі гэтых кніг — партызаны, таёжныя паляўнічыя, вучоныя-геолагі, партыйныя работнікі. Верны сваёй тэме пісьменнік і ў новым рамане *«Сибирь»*, першая кніга якога завершана аўтарам. Ідзе першая сусветная вайна, адчуваецца набліжэнне рэвалюцыі. Бальшавіцкі камітэт наладжвае пабег з Нарымскай ссылкі Івану Акімаву, каб той мог перабрацца ў Стакгольм, дзе ў гэты час знаходзіцца яго дзядзька прафесар Ліхачоў, і выратаваць ад замежных дзялкоў унікальныя навуковыя працы рускага вучонага аб Сібіры. Асноўная думка рамана — клопаты аб заўтрашнім дні, які нясе людзям шчасце.

ВАРАБ'ЁЎ Е. *«Земля, до востребования»*. Гэта кніга аб выдатным разведчыку палкоўніку Л. Е. Маневічу, якому ў 1965 г. пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Ён быў адным з самых таленавітых вучняў і дзейных памочнікаў Яна Берзіна, кіраўніка савецкай ваеннай разведкі ў 20—30 гг. Для Маневіча і яго баявых сапратнікаў вайна пачалася задоўга да чэрвеня 1941 г., да нападзення Гітлера на Савецкі Саюз, далёка ад яго граніц.

ЗАКРУТКІН В. *«Матерь человеческая»*. У гэтай аповесці пісьменнік расказаў гісторыю простай рускай жанчыны Марыі, аддаўшы ёй належнае за пераадоленне страшных удараў лёсу, за яе нястомную працу, за любоў да людзей і міласэрнасць, за мацярынскае цярпенне, за пралітыя ёю слёзы, за ўсё, што перажыла яна ў імя жыцця на любімай і пакутнай зямлі. Гэта — гімн жанчыне — цудоўнаму сімвалу жыцця і бессмерця роду чалавечага. Кнізе прысуджана Дзяржаўная прэмія імя М. Горкага.

СТАДНЮК І. *«Война»*. Раман. Кніга першая. Тэма рамана вельмі складаная і адказная — паказ пярэдадня Вялікай Айчыннай вайны, яе пачатку, самога ходу і завяршэння яе перамогай праз думкі і дзеянні людзей — ад радавога салдата да Вярхоўнага галоўнакамандуючага.

НАВУКА І ТЭХНІКА

# ЛУСКА РАСКАЗВАЕ

Пры раскопках старажытнага горада Херсанеса, што стаяў некалі ў Крыме недалёка ад цяперашняга Севастопаля, археолагі аднойчы наткнуліся на кучу рыбнай лускі. Старажытныя кухонныя адходы — знаходка даволі звычайная. І зацікавіла вучоных толькі адно: якую іменна рыбу лавілі ў моры старажытныя грэкі, што жылі тут дзве тысячы год назад?

Археолагі звярнуліся да вучоных-іхтыёлагаў з Інстытута біялогіі паўднёвых мораў Акадэміі навук СССР. Тыя хутка вызначылі, што луска належыць кефалі — звычайнай чарнаморскай промыславай рыбе. Але цяпер ужо біёлагаў захапіла цікавая, на іх погляд, акалічнасць: старажытная луска была буйнейшай, чым у сучаснай чарнаморскай кефалі. А значыць, і сама рыба была буйнейшай. Сярэдні размер сучасных экземпляраў — 35 см, «антычная» ж кефаль дасягала ў даўжыню 40 см.

Чаму ж стала драбнейшай кефаль?

У большасці сваёй чарнаморскія рыбы — выхадцы з Міжземнага мора. Туды ж, у сваю чаргу, рыбы трапляюць з Атлантычнага акіяна. Вядома, што ў Чорным моры «перасяленцы» драбнеюць. Напрыклад, маленькая, знаёмая ўсім хамса ў Міжземным моры мае даўжыню 20 см, а ў Атлантыцы, ля цёплых афрыканскіх берагоў — нават 25. Справа ў тым, што ў цёплай вадзе рыбы аднолькава актыўныя круглы год. У Чорным жа моры зімой тэмпература вады паніжаецца, і ў рыб наступае перыяд прыгнечання: яны мала ядуць, а значыць, і растуць марудней.

Так «антычная» кефаль пацвердзіла думку кліматолагаў, што ў тыя даўнія часы Чорнае мора было цяплейшае, праўда, усяго на 1—2 градусы. Але для рыб, як бачыце, гэта ўжо істотна.

**Р. ФЁДАРАЎ.**



14.35.

## З НАВУКОВАГА ПОГЛЯДУ

- *Кожны разумее па-свойму: адзін спачатку, а другі пасля.*
- *Нічога не браў пад сваю адказнасць. Гаворачы, што зямля круціцца, дадаў:*
  *— Па словах Каперніка.*
- *Майеру належыць афарызм:*
  *— Найлепшыя навуковыя адкрыцці зроблены ў найгоршых лабараторыях.*
- *Вучоны ведае, што такое невук, бо сам калісьці ім быў, але невук не разумее стану вучонага таму, што ніколі ім не быў.*
- *Ёсць тры віды невуцтва: не ведаць нічога, ведаць дрэнна тое, што ведаюць іншыя, і ведаць не тое, што належала б ведаць.*
- *Часта дах над галавою перашкаджае людзям расці.*

*СПОРТ*

# ВЯРНУЛІСЯ З ПЕРАМОГАЙ

*У канцы кастрычніка мужчынская зборная каманда універсітэта па баскетболу ўдзельнічала ў занальных спаборніцтвах першынства вну Беларусі.*

*У турніры ўдзельнічала 5 каманд: педагагічнага і інстытута замежных моў, медыцынскага, інстытута народнай гаспадаркі і універсітэта. Каманда БДУ добра падрыхтавалася да гэтых спаборніцтваў, правёўшы рад кантрольных сустрэч. Баскетбалісты універсітэта выйгралі ўсе сустрэчы і занялі першае месца. Найбольш упартай была сустрэча з суседзямі—мінскім педагагічным інстытутам. Толькі ў дадатковы час удалося зламаць супраціўленне будучых педагогаў і выйграць з розніцай у 3 ачкі.*

*Вясной 1973 года адбудзецца фінал першынства Беларусі па баскетболу, у якім прымуць удзел 8 мацнейшых каманд вну.*

*В. ШХІНЬЯН, трэнер зборнай каманды БДУ па баскетболу.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Заказ 1347. АТ 03391